*Волкаў М. А., Ляпееў М. В.*

**МЕДЫЦЫНА Ў ПОСТМАДЭРНІСЦКІХ ТВОРАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Ратынская Н. В.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г.Мінск*

Літаратура постмадэрнізма шырока вядома масаваму чытачу па творах Умберта Эка, Луі Борхеса, Джона Фаулза і іншых.Постмадэрнізм у літаратуры, як і постмадэрнізм у цэлым, вельмі цяжка паддаецца адназначнай дэфініцыі – няма поглядаў адносна дакладных прыкметаў феномена, яго межаў і значнасці. Адмаўляючы мадэрнісцкі пошук сэнсу ў хаатачным свеце, аўтар постмадэрнісцкага твору ўнікае, нярэдка ў гульневай форме, магчымасць сэнсу, а ягоны раман найчасцей з'яўляецца пародыяй гэтага пошуку. Постмадэрнісцкія пісьменнікі ставяць выпадковасць вышей за талент, а пры дапамозе самаіроніі і метапрозы, ставяць пад сумнеў аўтарытэт і ўладу аўтара. Пад пытанне ставіцца і існаванне мяжы паміж высокім і масавым мастацтвам, якую постмадэрнісцкі аўтар размывае, выкарыстоўваючы пастыш і камбінуючы тэмы і жанры, якія раней лічыліся няўдалымі для літаратуры.

Беларуская літаратура не адставала ад тэндэнцый сучаснай сусветнай культуры. У ёй не бракуе на сённяшні час твораў дадзенай плыні. Аналізуючы творы постмадэрнізму, мы спрабуем адшукаць медыцынскую тэматыку ў іх. Наколькі медыцына здольная ўплываць на найважнейшыя рысы дадзеных твораў: фрагментарнасць, іронія, чорны гумар. Вострасюжэтныя фабулы, кампазіцыя, стыль твора відавочна наўпрост прапарцыянальны вельмі трапнаму ўплыву медыцыны. Сучасны беларускі пісьменнік Альгерд Бахарэвіч удала здолеў спалучыць медыцынскую тэматыку і беларускія рэаліі ў сваіх творах: "Малая медычная энцыклапедыя" і "Гамбургскі рахунак". Акрамя Бахарэвіча медыцынскую тэматыку выкарыстоўвае Юры Станкевіч у творы "Любіць ноч – права пацукоў." Нарэшце, у медыцынскім апавяданні Васіля Быкава "Труп" апісваецца выпадак мазаічнай псіхапатыі, як алюзія на беларускую сучаснасць.

Мы паспрабуем даказаць, што медыцынскія фабулы здольныя натхніць пісьменніка на эксперыменты, у тым ліку і на гульнёвую паэтыку.